**Пятушка, А.** Вайна вачыма салдата / А. Пятушка // Браслаўская звязда. – 2016. – 10 лют. – С. 2.

# ВАЙНА ВАЧЫМА САЛДАТА



**З успамінаў Юрыя Андрука, работніка ПУП «Аўтасэрвіс – Браслаў»:**

Пасля заканчэння школы вучыўся ў Гарадоцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме. У мясцовым ДТСААФ займаўся на курсах парашутыстаў і зрабіў тры скачкі.

У маі 1983 года прызвалі ў армію. У «вучэбцы» ў Фергане атрымаў ваенную спецыяльнасць зараджаючага – наводчыка самаходнай артылерыйскай устаноўкі «Нона». Падрыхтоўка была вельмі напружанай. На службу накіравалі ў Кабульскі артполк.

Першыя ўражанні ад далёкай краіны: блакітнае чыстае неба і прыгожы горад ля падножжа гор. Служба праходзіла на заставе побач з Кабулам, да некантралюемай тэрыторыі – ўсяго 9 км. Штодня былі фізічная падрыхтоўка, трэніровачныя стрэльбы па гарах.

Неаднойчы хварэў на ліхарадку, давялося і голад спытаць. За любы праступак жорстка наказвалі. Прымаў удзел у 20 баявых выхадах. Лічу сябе шчаслівіцам, бо застаўся жывым.

Калі прыйшоў загад аб звальненні ў запас, то разам з таварышам узняліся ў 4 гадзіны раніцы і пешшу дабраліся да цэнтра Кабула.

Як усё гэта ўспрымаў? Радзіма дала наказ, а гэта – святое. І, нягледзячы на ўсе жахі, што давялося перажыць, у памяці засталіся самыя добрыя ўспаміны пра таварышаў і баявую маладосць. Пасля службы стаў больш цаніць жыццё. І па сённяшні дзень ганаруся, што з годнасцю прайшоў усе ваенныя выпрабаванні.

**Алена Пятушка**

***Фота аўтара***